# ІХТЫЯЛАГІЧНЫЯ І ЭНТАМАЛАГІЧНЫЯ НАМІНАЦЫІ Ў АЙКАНІМІІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*Т.А. Грачыха*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Рэпазіторый ВДУ

У апошнія дзесяцігоддзі тапанімічныя даследаванні, у тым ліку і айканімічныя, атрымалі шырокае развіццё. Тапаніміка знаходзіць практычнае прымяненне ў лінгвістычных, гістарычных, геаграфічных навуках. Актуальным у айканіміі з'яўляецца вывучэнне рэгіянальных уласных назваў населеных пунктаў. Айконімы, суадносныя з назвамі прадстаўнікоў жывёльнага свету, з'яўляюцца маладаследаванымі ў беларускім мовазнаўстве. Мэта нашай працы – вызначыць спецыфіку намінацый вёсак Віцебскай вобласці, утвораных на аснове іхтыялагічных і энтамалагічных намінацый.

**Матэрыял і метады.** Крыніцай для даследавання моўных асаблівасцей населеных пунктаў з кампанентам назваў рыб і насякомых паслужылі тапанімічныя, тлумачальныя, этымалагічныя, дыялектныя слоўнікі, энцыклапедычныя даведнікі, на аснове якіх быў сабраны і прааналізаваны айканімічны матэрыял. Метады даследавання – апісальны і параўнальна-супастаўляльны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Айконімы любой тэрыторыі ў абсалютнай сваёй большасці індывідуальныя і непаўторныя. Найбольш акрэслена гэта праяўляецца ў іх семантыцы. Назвы населеных пунктаў, суадносныя з найменнямі жывёльнага свету, даволі блізкія па этымалогіі, семантыцы і форме. На тэрыторыі Віцебшчыны зафіксавана 232 айконімы з заалагічным кампанентам. Яны складаюць больш ці менш выразна акрэсленыя групы і тыпы, што дае магчымасць сістэматызаваць і раскласіфікаваць зафіксаваныя ў Віцебскай вобласці айканімічныя адзінкі на назвы населеных пунктаў, суадносныя з назвамі звяроў, птушак, рыб, насякомых і інш.

Тып айконімаў, у аснову якіх пакладзены іхтыялагічныя намінацыі, сустракаецца даволі часта на тэрыторыі Віцебшчыны, што абумоўлена наяўнасцю вялікай колькасці азёр і рэк і пасяленнем людзей побач з вадаёмамі, у якіх вадзіліся тыя ці іншыя прадстаўнікі рыб. У айканімічнай сістэме Віцебскай вобласці найменні, суадносныя з назвамі рыб, складаюць 32 адзінкі. Найбольш ужывальнымі з'яўляюцца айконімы, суадносныя з лексемай *карп*: *Карпіна, Карпікі, Карпінічы, Карпаўка, Карпаўшчына, Карпавічы.* Але навукоўцы не даюць адназначнага тлумачэння ўзнікненню дадзеных айконімаў. На думку В. Жучкевіча, такія айконімы ўтварыліся ад імя Карп [2, 230].

Карась – распаўсюджаны прадстаўнік іхтыяфаўны ў беларускіх вадаёмах. На Віцебшчыне адзначана 2 айконімы, суадносныя з лексемай *карась*: *Карасі* (Глыбоцкі, Мёрскі раёны)*, Карасіна* (Браслаўскі раён). Паводле В. Жучкевіча, гэтыя айконімы ўтвораны ад назвы рыбы карась [1, 153]. З лексемай *шчука* суадносныя таксама 2 айконімы: *Шчучына* (Віцебскі раён)*, Шчукі* (Бешанковіцкі раён). На думку У. Юрэвіча, "у аснове назвы вёсак рускі патронім Щука (шчупак), утвораны як мянушка чалавека, што лавіў шчупакоў" [3, 223].

Адзначаны адзінкавыя назвы населеных пунктаў з іхтыялагічным кампанентам. Так, айконім *Угрова* (Глыбоцкі раён) суадносны з назвай *вугор*, якая абазначае вядомага прадстаўніка сям'і вугровых. Населены пункт *Акуні* (Гарадоцкі раён) паходзіць ад назвы *акунь*, рыбы сям'і акунёвых, якая водзіцца ва ўсіх вадаёмах Беларусі.

Зафіксаваны айконім *Курмялёўка* (Лепельскі раён), суадносны з дыялектнай лексемай *курмель*, пашыранай на Віцебшчыне для абазначэння печкура, прадстаўніка сям'і карпавых [1, 19]. Ад назвы рыбы *галавень* (Полацкі раён) утварыўся айконім *Галаўні*. Састаўная назва населенага пункта *Востраў Лешч* (Мёрскі раён) звязана з ляшчом, рыбай сям'і карпавых, які добра лавіўся на азёрным востраве каля вёскі. Апелятыў *рыба* пакладзены ў аснову наступных айконімаў: *Рыбнае, Рыбчаны, Рыбчына, Рыбачкі, Зарыбіна*. У гэтых населеных пунктах людзі актыўна займаліся рыбалоўствам, паколькі ў вадаёмах вадзілася шмат рыбы.

У айканімічнай сістэме Віцебскай вобласці найменні, суадносныя з назвамі насякомых, складаюць 22 адзінкі. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца айконімы,

суадносныя з лексемай *камар: Камары, Камарова, Камарышкі, Камароўшчына, Запольскія Камары.* Прыродна-кліматычныя асаблівасці Віцебшчыны спрыялі распаўсюджанню вялікага мноства камароў, што выводзяцца ў вадаёмах. Вёска магла атрымаць назву, суадносную з лексемай *камар*, за вялікую колькасць гэтых насякомых у яе наваколлі. В. Жучкевіч выказвае думку наконт таго, што айконім утварыўся ад прозвішча Камар, у аснове якога ляжыць найменне насякомага [2, 170]. Айконім можа паходзіць ад мянушкі, якую чалавек атрымаў за свае паводзіны, што нагадвалі паводзіны надакучлівага камара.

Распаўсюджанымі ў рэгіёне з'яўляюцца айконімы, утвораныя ад лексемы *мурашка*: *Мураўі, Мурашкі, Мурашчына, Мураўнічы, Мураўшчына.* На думку У. Юрэвіча, "у лесе, які атуляў вёску, было шмат мурашак, мураўёў. Адсюль айконім. А людзі, якія шчыруюць на зямлі, як тыя мурашы, мелі спачатку мянушку Муравей, якая потым легла ў аснову прозвішча Мураўёў "[3, 239].

Адзначаны на Віцебшчыне айконімы, суадносныя з лексемай *мядзвёдка: Мядзвёдка* (Віцебскі раён)*, Мядзвёдкі* (Глыбоцкі раён)*, Мядзвёдаўка* (Лепельскі, Шумілінскі раёны). Мядзвёдка – шкоднае насякомае. Яна корміцца карэннем раслін, чым і наносіць шкоду сельскай гаспадарцы. Хутчэй за ўсё, прыведзеныя айконімы ўтварыліся ў сувязі з тым, што ў наваколлі гэтых пасяленняў былі месцы, дзе вадзілася вялікая колькасць мядзвёдак.

Энтамалагічныя назвы пакладзены ў аснову айконімаў *Мушына* (Верхнядзвінскі, Мёрскі раёны)*, Муханава* (Аршанскі раён), суадносных з лексемай *муха:* муха, мушка – двухкрылае насякомае.

Сустракаюцца на Віцебшчыне назвы населеных пунктаў, утвораныя ад лексемы *жукі*: *Жучкі* (Глыбоцкі, Чашніцкі раёны)*, Ложныя Жучкі* (Шаркаўшчынскі раён). Жукі – атрад насякомых, пашыраны на ўсёй Беларусі. В. Жучкевіч лічыць, што ў аснове гэтых айконімаў ляжыць прозвішча Жучок, утворанае ад назвы насякомага жук [2, 126].

Зафіксаваны і адзінкавыя айконімы: *Шаршні* (Віцебскі раён)*, Клапы* (Талачынскі, Шумілінскі раёны)*, Блошнікі* (Мёрскі раён), суадносныя з назвамі такіх насякомых, як шэршань, клоп, блыха.

У айканімічнай сістэме Віцебшчыны адзначаны населеныя пункты, суадносныя з назвамі рыб і насякомых, якія бытуюць у некалькіх раёнах рэгіёна. Гэта такія айконімы, як Карасі, Карпавічы, Камарова, Камароўшчына, Камары, Клапы, Мураўшчына, Мурашчына, Мурашкі, Жучкі, Мядзвёдаўка.

**Заключэнне.** Айконімы, суадносныя з назвамі рыб, складаюць каля 14% ад агульнай колькасці найменняў, суадносных з назвамі прадстаўнікоў жывёльнага свету. Гэта не выпадкова, бо на тэрыторыі Віцебскай вобласці знаходзіцца вялікая колькасць вадаёмаў, у якіх водзяцца разнастайныя віды іхтыяфаўны, назвы некаторых з іх леглі ў аснову найменняў населеных пунктаў. Айконімы, суадносныя з назвамі насякомых, складаюць каля 10% ад агульнай колькасці зафіксаваных намі айконімаў з заалагічным кампанентам. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца назвы населеных пунктаў, суадносныя з лексемамі *рыба, карп, камар і мурашка*.

*Спіс літаратуры*


1. Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік іхтыя- і герпетафаўны Беларускага Паазер'я / Т.А. Грачыха. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2006. – 31 с.
2. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь / В.А. Жучкевич.– Минск: Издательство БГУ, 1974. – 448 с.
3. Юрэвіч, У.М. Слова жывое, роднае, гаваркое… / У.М. Юрэвіч. – Мінск: Юнацтва, 1992. – 271 с.


Репозиторий ВГУ